**ИСТОЧНИКИ:**

1. Романович Ольга Григорьевна, жительница д. Мотоль Ивановского р-на, Брестской обл.
2. Кухарчук Мария Ивановна, жительница д. Вулька-Достоевская, Ивановского р-на, Брестской обл.
3. Бурак Надежда, жительница д. Вулька-Достоевская, Ивановского р-на, Брестской обл.
4. Пашкевич Николай Дмитриевич, житель д. Рубель, Столинский р-н, Брестская обл.
5. Гриневич Варвара Павловна, жительница д. Цна, Лунинецкого р-на, Брестской обл.
6. Коваль Екатерина Семеновна, жительница д. Черни, Брестского р-на, Брестской обл.
7. Клундук Алла Васильевна, жительница г. Бреста.
8. Тарасевич Евгения Ильинична, жительница г. Бреста.
9. Кротович Анна Григорьевна, жительница г. Бреста.
10. Качан Ольга Григорьевна, жительница д. Белая, Каменецкого р-на, Брестской обл.
11. Семенюк Ольга Федоровна, жительница д. Тевли, Кобринского р-на, Брестской обл.
12. Горохова Валентина Александровна, жительница г. Бреста.
13. Кисель Николай Максимович, житель Столинского р-на, Брестской обл.
14. Мишевич Степан Иванович, житель Кобринского р-на, Брестской обл.
15. Ляшук Мария Ивановна, д. Навицковичи, Каменецкого р-на, Брестской обл.
16. Сергеева Ольга Антоновна, жительница д. Белая, Каменецкого р-на, Брестской обл.

**ПИВОВАРЧИК С.В.**
Доктор исторических наук, доцент, заведующий кафедрой истории Беларуси, археологии и специальных исторических дисциплин Гродненского государственного университета им. Я. Купалы, г. Гродно, Беларусь

## ГРОДЗЕНСКАЯ КРЭПАСЦЬ НАПЯРЭДАДНІ І Ў ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

Традыцыі гродзенскай фартыфікацыі былі закладзены ў эпоху сярэднявечча. Ужо сама летапісная назва горада "Горадзень" сведчыць, што горад узнік як агароджанае ўмацаваннямі месца. Тапаграфічнае размяшчэнне паселішча на мысе пры ўпадзенні Гарднічанкі, высокі стромкі бераг Нёмана. Глыбокія яры склалі вельмі зручныя тапаграфічныя ўмовы для развіцця вайскова-інжынернай думкі. Гродна ўзнік на этнакультурным памежжы, і палітычныя падзеі, што адбываліся ў гэтым рэгіёне, таксама ўплывалі на фармаванне абарончых элементаў горада. Яны прайшлі эвалюцыю ад прасцейшых дрэва-земляных канструкцый да магутных фартыфікацыйных збудаванняў. Кожны перыяд у гісторыі горада адбіўся на яго ўмацаваннях, якія адпавядалі часу і традыцыі: земляны вал і драўляныя сцены дзядзінца (якія былі ўжо ў XII ст. заменены на каменныя – унікальная з'ява) і вакольнага горада часоў Полацкага княства. Потым былі гатычны замак перыяду Вялікага княства Літоўскага, рэнесансная і барочная архітэктура з абарончымі рысамі часоў Рэчы Паспалітай, рэдуты і люнеты паўночнай вайны і паўстання пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі. Не быў выключэннем і час, калі Гродна быў у складзе Расійскай імперыі

Першы план узвядзення фартыфікацый у Гродне, якія адпавядалі б тагачаснай вайсковай тактыцы і стратэгіі, з'явіўся адразу пасля канчатковай анексіі Расійскай імперыяй беларускіх зямель у выніку трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай. У Цэнтральнай Еўропе адбылася змена геапалітычнай сітуацыі і ўсталяванне новай мяжы імперыі з заходнімі суседзямі. Цяпер расійска-пруская мяжа праходзіла ўздоўж Нёмана ад Усходняй Прусіі да Гродна. Здавалася, што заходняя мяжа Расіі стабільная і змяняцца ўжо не будзе. Вышэйшыя расійскія вайсковыя ўлады прыступілі да прац, звязаных з інжынерным забеспячэннем новай мяжы імперыі. Да таго ж трэба было паказаць свету, што Расія замацоўваецца на далучаных землях сур'ёзна і надоўга.

У 1796 г. была створана спецыяльная камісія пад кіраўніцтвам шэфа Корпуса інжынераў генерал-маёра інжынера П. Сухтэлена. На заходнюю мяжу для вывучэння становішча быў накіраваны інжынер-капітан К. Оперман. Вынікам яго працы стала інструкцыя "Обеспечение новой границы с Пруссией и Австрией". Ён прапанаваў на працягу 1200 км пабудаваць дзевяць крэпасцей, у тым ліку і ў Гродне.

Далей распрацоўку фартыфікацыйнага ўмацавання заходняй мяжы імперыі правёў генерал-маёр інжынер М. Дэволан. У сваім праекце ў 1797 г. ён прапанаваў цэлую абарончую сістэму з крэпасцей, якія ўтваралі тры лініі. Згодна плану, першая лінія адпавядала праекту К. Опермана, другая лінія размяшчалася ў адлегласці 100 – 80 км і ўключала крэпасці-склады ў Ворне, Вільні і Слоніме; трэцяя лініія складалася з першакласных крэпасцей у Рызе і Кіеве. Такі спосаб абароны мяжы дазваляў у залежнасці ад палітычна-вайсковай сітуацыі даволі эластычна будаваць тактыку абароны і наступлення. У тым жа 1797 г. распачаліся працы па рэалізацыі названых вышэй планаў, аднак канчаткова яны не былі здзейснены. Расія, якая вяла шматлікія войны падчас панавання Кацярыны II, сродкаў на рэалізацыю планаў фартыфікацыйнага ўмацавання (а кошт быў вельмі вялікі) на той час ужо не мела. Акрамя сродкаў, не хапала і адпаведных кваліфікаваных кадраў для крапаснога будаўніцтва, паколькі вяліся ў асноўным наступальныя войны і інжынерных часцей было няшмат.

У 1801 г. пасля ўступлення на трон імператара Аляксандра I было пастаўлена пытанне аб фартыфікацыйным умацаванні мяжы з заходнімі суседзямі. У 1804 г. інспектар Корпуса інжынераў генерал Сухтэлен атрымаў дазвол на стварэнне Інжынернай экспедыцыі для прац у заходніх губернях. Аднак вайна з Напалеонам у 1805 – 1807 гг. не дазволіла закончыць гэтыя працы, а далучэнне да кантынентальнай блакады супраць Англіі прымусіла звярнуць увагу ў першую чаргу на ўмацаванне ўзбярэжжа.

Пасля франка-аўстрыйскай вайны стала зразумелым, што канфлікт паміж Францыяй і Расіяй непазбежны. З 1810 г. Расія пачала інтэнсіўна рыхтавацца да вайны. У склад камісіі па падрыхтоўцы да баявых дзеянняў быў уключаны генерал-маёр інжынер К. Оперман, які тэрмінова вярнуўся да плана стварэння фартыфікацый на захадзе: у Коўне, Вільні, Гродне і Брэст-Літоўску. Аднак канчатковае рашэнне было іншым: новыя крэпасці былі пабудаваны ў глыбі імперыі – Дынабургу і Бабруйску з перадмаставым умацаваннем у Барысаве на перадполлі. Тым самым была праігнаравана актыўная абарона і ў магчымым канфлікце ініцыятыва была аддадзена праціўніку [1, с. 202-203].

Як павінна была выглядаць новая расійская фартэцыя ў Гродне, даюць уяўленне архіўныя графічныя матэрыялы. Паводле недатаванага "Плана г. Гродно с проэктами укрепления оного", абарончыя збудаванні павінны былі ахапіць увесь горад. У склад крапаснога комплекса ўваходзілі капаніры, люнеты, валы з равелінамі, абарончыя сцены з гласісамі, стралковыя рвы, батарэі на Старым замку, Новым замку і на месцы дома Мураўскіх на вул. Маставой. Для затаплення мясцовасці падчас небяспекі на Гарднічанцы планаваліся чатыры плаціны. На левым беразе павінна было быць пабудавана перадмаставое ўмацаванне – "тэт дэ пон", аснову якога складаў францішканскі кляштар. Гэты план падпісалі расійскія вайсковыя інжынеры палкоўнік Баўмер і капітан Дэн [2].

Другі план датуецца 1807 г. Ён мае подпіс генерала Сухтэлена і называецца "План города Гродны с означением вновь проектируемой крепости". Ад плана без даты адрозніваецца большай плошчай, якая уключана ў сістэму ўмацаванняў – увайшлі Гарадніца, Станіслававa, тэрыторыя левага берага Гараднічанкі. Значна большых памераў планавалася перадмаставое ўмацаванне на фарштаце [3].

Названыя тапаграфічныя планы былі вынікам працы Інжынернай экспедыцыі П. Сухтэлена, якая працавала да ўтварэння Каралеўства Польскага. Наступны графічны план звязаны ўжо непасрэдна з дзейнасцю Опермана ў камісіі па падрыхтоўцы да вайны з Напалеонам. Ён мае легенду па-нямецку "Plan eines Befestigungs – Entwurf auf die Stadt Grodno in Litthauen" і два надпісы алоўкам – "ca 1810" і прозвішча магчымага аўтара "Verfasst von dem Major von Keck". Нямецкае прозвішча і надпісы па-нямецку не павінны здзіўляць. У гэты час на службу да расійскага імператара паступіла шмат афіцэраў з разгромленай прускай арміі, якія ўцяклі ў Расію. Дастаткова ўспомніць, што бліжэйшым дарадцам Аляксандра I ў вайсковых справах быў былы прускі генерал Фуль. Верагодна, што адзін з такіх уцекачоў-інжынераў і выканаў па загаду Опермана план фартыфікацыі Гродна ў 1810 г.

У вайскова-інжынерных адносінах гэты быў добра складзены праект. Ён выдатна ўлічваў тапаграфію не толькі горада, але і ваколіц і складаўся з трох элементаў: цытадэлі на левым беразе Гараднічанкі, замкнутага шматграннага кола курцін з бастыёнамі вакол горада з прадмесцямі, чатырох знешніх высунытых умацаванняў, з якіх найбольш дасканалы быў "тэт дэ пон" на занёманскім фарштаце [4, с. 231-235].

Пасля вайны 1812 г. на Гродна звярнулі ўвагу ўжо ў канцы 20 – х гг., пасля таго, як імператарам стаў Мікалай I (ён быў шэфам Корпуса інжынераў). У 1827 г. была створана камісія для высвятлення стратэгічнага значэння фартыфікацый, што ўжо існавалі, і распрацоўкі новых. Адразу ў камісіі распачалася дыскусія, дзе будаваць новую крэпасць – у Брэсце ці Гродне. Праектныя працы праводзіліся адразу па двух гарадах, але ў 1830 – 1842 гг. была пабудавана крэпасць Брэст-Літоўск.

Аднак лістападаўскае паўстанне 1831 г. прымусіла царскія ўлады зноў вярнуцца да плана стварэння фартэцыі ў Гродне. Аб гэтым сведчыць "Увеличенный план города Гродно с наложением проекта укрепления оного", які быў "сочинен" 29 лістапада 1831 г. паручнікам Лабачэўскім. Гэты план у параўнанні з папярэднімі быў значна спрошчаны, без люнетаў, бастыёнаў і батарэй, а абарончым гласісам планавалася абнесці тэрыторыю, абмежаваную вуліцай Траецкай, дамініканскім, брыгіцкім і бернардынскім кляштарамі [5]. Як і папярэднія, гэты праект не быў рэалізаваны. Усе праекты будаўніцтва ў Гродна крэпасці ў першай трэці XIX ст. не былі здзейснены з-за адсутнасці фінансавых сродкаў. Няцяжка заўважыць, што, калі б расійскім уладам не бракавала грошай на рэалізацыю планаў па фартыфікацыйнаму ўмацаванню сваёй заходняй мяжы, Гродна напаткаў бы лёс Бабруйска і Брэста, якія былі разбураны будаўніцтвам крэпасцей. Грамадзянская забудова горада была б знішчана, культавыя комплексы прыстасаваны пад вайскова-інжынерныя патрэбы, жыхары выселены на новыя землі.

Думка аб узмацненні Гродна зноў паўстала на стратэгічнай нарадзе, якая адбылася ў 1873 г. пад асабістым кіраўніцтвам імператара Аляксандра II. На нарадзе была прызнана важнасць умацавання абарончай лініі на Нёмане, паколькі ўсё больш відавочным станавіўся верагодны праціўнік – Германія, з якой прыдзецца сутыкнуцца ў барацьбе за свае інтарэсы. У 1879 г. сфармаваўся Двайчны саюз, які потым ператварыўся ў Траічны – Германія, Аўстра-Венгрыя, Італія. Гэта, як пісаў А.М.Заянчкоўскі, "привело русский Генеральный штаб к трем следующим выводам:

1) что враждебный союз, и в особенности Германия, опередили Россию в деле боевой подготовки;

2) при современных условиях еще в мирное время должны быть составлены не только общие соображения об употреблении вооруженных сил в случае войны, но и тщательно разработанные расчеты о сроках и районах сосредоточения их;

3) вследствие преимущества в быстроте сосредоточения войск враждебной стороны, наши соображения должны быть для начального периода кампаний приурочены к обороне, а наша военная подготовка направлена на усиление границ и на улучшение существующих крепостей" [6, с. 32].

У наступныя гады па распараджэнні Галоўнага штаба праводзіліся палявыя працы: рэкагнасціроўкі, здымкі, картаграфаванне. На падставе гэтага ваенным міністрам Д. Мілюціным у 1879 г. быў зроблены даклад аб умацаванні Коўна, Гродна і Асаўца. Даклад быў зацверджаны імператарам, і паступіў загад прыступіць да выканання. Паводле гэтага даклада, Гродзенскай умацаванай пазіцыі адводзілася наступная стратэгічная задача (дакумент на мове арыгінала) "...с объявлением войны и вступлением неприятельской армии в наши пределы, прочное занятие нами Гродненской позиции в связи с Ковной и с линией Бобр – Нарев – Буг представит неприятелю значительное затруднение при дальнейшем его движении как к Неману, так и в тыл Царства Польскага, в обход находящихся там наших войск.

Соответственно с таким назначением должны быть возведены и самыя укрепления у Гродны. При крепком занятии нами Ковны и Осовца неприятелю не представиться возможность подвести к Гродно осадную артиллерию в скором времени после открытия военных действий, нападения же на Гродну больших неприятельских сил, но без орудий осадного парка, можно допустить и в начальный период компании, в особенности со стороны левого берега Немана, когда армия наша удерживает за собой правый берег этой реки. С северной же стороны, Гродна должна быть обеспечена лишь от нечаенного нападения небольших неприятельских отрядов, могущих подойти внезапно по преходу через Неман выше или ниже этого пункта.

Переход же на правый берег Немана значительной части неприятельских армий и удаление нашей к востоку от этой линии неминуемо поведет к полному обложению Гродненского гарнизона, а потому, при таком обороте военных действий гарнизон этот, или должен оставить занимаемый им пункт и следовать за армией, или должен быть значительно усилен и обороняться до последней крайности" [7, л. 2-2об]. На падставе гэтага даклада распрацавалі план пабудовы ўмацаванай пазіцыі, якая складалася з пяці фартоў на 64 гарматы і 10 рот пяхоты. Аднак тады гэты план не быў здзейснены.

Зноў да яго вярнуліся ў 1887 г. пасля зацвярджэння "Соображений о планах ведения войны", складзеных начальнікам Галоўнага штаба М.Обручавым (1880 г.). Яго прапановы зводзіліся да таго, каб стрымліваць ворага на адным тэатры баявых дзеянняў і рыхтавацца да рашучага наступу на другім. Праваму флангу, дзе знаходзілася Гродна, адводзілася задача стрымліваць праціўніка (германскія войскі).

Будаўніцтва фартоў пачалося ў 1887 г., і на працягу двух гадоў яно было завершана. У 1889 г. было прызнана, што пяці фартоў мала, і прынята рашэнне аб будаўніцтве яшчэ двух. Форт №1 размяшчаўся на правым беразе Нёмана ва ўрочышчы Пышкі, фарты № 2-5 складалі так званую паўднёвую пазіцыю і былі выцягнуты ўздоўж занёманскага фарштата. Фарты № 6-7 будаваліся ўжо ў 90-я гг. на правым беразе Нёмана. Агульная працягласць пазіцыі складала 14 км.

Усе фарты былі ўзведзены з зямлі і мелі характар перадмаставой пазіцыі часовага характару. Войскамі ўмацаванні практычна не выкарыстоўваліся, таму напачатку XX ст. фактычна былі закінуты. У дакладзе Штаба Віленскай вайсковай акругі ў 1907 г. у адносінах да гродзенскіх умацаванняў адзначалася: "...существующие форты Гродненской позиции в настоящее время утратили своё значение и не только не способны служить в качестве опорных пунктов, основой будущей позиции, но и не могут быть в должной мере усовершенствованы. Последнее исключительно по причине недостаточной примененности их к местности ( в отношении маскировки) и по слишком близкому их расположению к мостам.

Приходится согласиться, что Гродненской укрепленной позиции, строго говоря не существует, а есть место, на котором может быть устроена позиция и на котором форты играют роль только местных предметов, удобных для обороны. Последствием сказанного является то, что проектированные планом мобилизации укрепления, возводимые во время последней, места которых выбраны при условии, что существующие форты должны служить основой позиции, не отвечают современной обстановке, ни задачам возлагаемым на Гродну, что в свою очередь низводит существующий мобилизационный план до обыкновенного теоретического проекта, осуществление которого во время войны не только затруднительно, но и не желательно" [7, л. 4].

Стратэгічнае значэнне Гродна ўзрасло пасля руска-японскай вайны ў сувязі з распрацоўкай новых мабілізацыйных планаў. Зменены план вайны патрабаваў сур'ёзнай карэкціроўкі ўсёй крапасной сістэмы Расіі. У адпаведнасці з планамі 1908 і 1910 гг. аб адводзе лініі стратэгічнага разгортвання ў глыб краіны захоўваліся і перабудоўваліся крэпасці Свіяжск, Выбарг, Кранштад, Усць-Двінск, Коўна, Асавец, Новагеоргіеўск, Брэст-Літоўск, Ачакаў, Севастопаль. Ліквідаваліся крэпасці Варшаўскага раёна: Івангарад, Загрж, Ломжа, Астраленка, Ражаны, Пултуск, а таксама Керч. З увядзеннем плана 1912 г. на лініі разгортвання павінны быць умацаваны Коўна, Брэст-Літоўск, Асавец, Гродна. Першыя тры крэпасці мадэрнізаваліся, апошнюю фактычна прыходзілася будаваць па-новаму [8, с. 104].

Неабходнасць будаўніцтва новай фартэцыі ў Гродне была выказана яшчэ ў 1907 г. у дакладе Штаба Віленскай вайсковай акругі ў сувязі з падрыхтоўкай новага мабілізацыйнага плана. Там адзначаны ўмовы, пры якіх праект новай умацаванай пазіцыі будзе паспяховым:"... чтобы тот проект укрепления позиции под Гродной, который будет вновь выработан, не постигла печальная участь всех ему предшествующих – быть мертворожденным, необходимо получить предварительно указания: 1) какие дененжные и материальные средства могут быть ассигнованы для указанной цели и 2) какие именно войска будут назначены с объявлением мобилизации для производства работ по устройству позиции, и какие войска будут назначены для ее занятия.

Только по разрешении этих вопросов может быть приступлено к проектированию позиции, которая в зависимости от предназначенных для нее средств, может быть устроена в пределах от простой предмостной позиции до круговой оборонительной позиции стратегического характера" [7, л. 11об].

Як вынікае з архіўных матэрыялаў, першыя праекты новых абарончых збудаванняў каля Гродна былі зроблены ўжо ў 1909 г. Аднак асноўныя даследаванні і работы па праекцiроўцы адбываліся ў 1911 – 1912 гг. З кастрычніка 1912 г., калі Гродна быў абвешчаны апорным пунктам для арміі, пачаліся будаўнічыя працы на галоўнай пазіцыі, якая мела эліпсападобны абрыс. Працягласць пазіцыі была каля 60 км, што падводзіла ўсю крэпасць пад тып "крэпасці шырокага размяшчэння".

У адпаведнасці з "Положением о порядке разрешения вопросов по созданию новых и переустройству существующих крепостей" ад 25 ліпеня 1911 г. была створана "изыскательная партия для разработки первоначального проекта крепости на месте". Кiраўніком партыі прызначылі начальніка 26-й пяхотнай дывізіі (месца дыслакацыі – Гродна) генерал-лейтэнанта Міхаіла Нікіфаравіча Кайгародава. Партыя складалася з дзвюх частак: інжынернай і артылерыйскай, якімі кіравалі адпаведна палкоўнікі Дзмітры Паўлавіч Каласоўскі і Барыс Раманавіч Трызна. У складзе партыі знаходзіліся прыкамандзіраваныя інжынерныя і артылерыйскія спецыялісты. Працы па складанню праекта крэпасці Гродна пачаліся 3 лістапада 1911 г., а 7 студзеня 1912 г. першапачатковы варыянт быў ужо прадстаўлены ў ГІУ. У сваім рапарце на імя генерала-кварцірмейстра М.М. Данілава Кайгародаў прасіў не расфарміроўваць "Изыскательную" партыю, "поскольку в создаваемой крепости Гродна предстоит составить в несколько раз больше число проектов, по сравнению со всякой расширяемой или перестраиваемой крепостью, где многое уже существует, а типы сооружений давно подробно разработаны и многие из них уже осуществлены на деле" [9, л. 13].

Па першапачатковаму плану, гродзенская крэпасць павінна была складацца з 16 тыповых фартоў (на той час такімі былі фарты, распрацаваныя ваеннымі інжынерамі К.І. Вялічкам, А.Н. Буйніцкім і В.В. Малкавым-Паніным), 18 літарных апорных пунктаў на паўроты (так званыя "малыя фарты"), 38 нумарных апорных пунктаў на ўзвод пяхоты. Пасля абмяркавання ў Галоўным Інжынерным Камітэце ў план былі ўнесены змены і яго зноў разгледзелі ў Камітэце 2 чэрвеня 1912 г.

У новым плане колькасць фартоў зменшылася да 13, нумарных апорных пунктаў да 23, а літарныя павялічыліся да 19. Акрамя фартоў і апорных пунктаў, планавалася будаўніцтва адкрытых батарэй для гармат буйнога калібру, асобныя сховішчы для пяхоты, парахавыя паграбы, аэрадром, плацiны, дарогі і шмат іншых дапаможных збудаванняў. Была вызначана мяжа крапаснога раёна. Яна праходзіла прыкладна за 10 км ад праекціруемых ліній фартоў і ўключала наступную тэрыторыю: ад р. Нёман на захад па Аўгустоўскаму каналу да шашы каля в. Чортак, затым па шашы на м. Сапоцкін і далей на паўднёвы захад па дарозе на в. Кайчаны і Ліпск, ад Ліпска па р. Сідра, Сідорка, праз м. Сідра да в.Цімані, ад в.Цімані па дарозе да ст. Кузніца, з станцыі Кузніца па дарозе праз в. Падліпкі да м. Індура, ад м. Індура па р. Індурка, Лашанка, Свіслач да р. Нёман. Па р. Нёман уверх па цячэнні да в. Плавы, ад в. Плавы па р. Котра, Піра праз в. Гушыцы, Машталеры да м. Азёры. Ад м. Азёры на поўнач па азёрах да ст. Парэчча. Па чыгунцы на паўднёвы-захад да паўстанка Сабаляны, па дарозе на в. Сабольцы, Верхаполле, Крынічна, Плябанішкі да в. Пальніца, а затым па Нёману да Аўгустоўскага канала [10, л. 4].

Зменены праект пабудовы гродзенскай крэпасці быў зацверджаны Мікалаем II 4 жніўня 1912. Стратэгічна крэпасці Гродна было наканавана: "1) Преграждать Санкт-Петербургско-Варшавскую железную дорогу и шоссе от Августова и Осовца на Лиду при пересечении их с р. Неман; 2) Облегчить свободу действий наших войск на обоих берегах р. Неман, сохраняя в наших руках железнодорожные и обыкновенные переправы через р. Неман в Гродно; 3) Совместно с укреплениями Ковно и Олиты содействовать нашему наступлению в Восточной Пруссии или южнее, а равно наступательной обороне р. Неман; 4) Служить опорою наших войск впереди р. Неман и по верхнему течению р. Бобр; 5) В случае удаления от крепости Гродна наших полевых войск, сохранять во всяком случае переправы через р. Неман и Гродненский железнодорожный узел в наших руках" [10, л. 6].

У прадпісанні ГІКа ад 1 верасня 1912 г. будаўніку Гродзенскай крэпасці (так называлася пасада кіраўніка ўсіх будаўнічых прац, на якую 2 ліпеня 1912 г. быў прызначаны Д.П. Каласоўскі з адначасовым прысваеннем чына генерал-маёра) указвалася, як трэба размяркаваць крэдыты па праектаванню і будаўніцтву аб'ектаў крэпасці "... 3) Представить теперь же план распределения кредитов на 4-летие 1912-1915 гг. руководствуясь соображением стоимости инженерных работ и заготовок имея в виду: а) что в счет исчисленной на работы по созданию Гродненской крепости суммы в размере 15 950 000 руб. уже ассигновано в 1912 г. – 204 000 руб. и предназначено к ассигнованию: в 1913 г.– 3 746 000 руб.; в 1914 г. – 5 000 000 руб. и 1915 г. – 7 000 000 руб. ..." [10, л. 1об]. Трэба адзначыць, што выдзеленых грошай было недастаткова. Так, напрыклад, кошт будаўніцтва толькі аднаго форта № 4 каля в. Стрэльчыкі складаў 2 300 000 руб па цэнах 1913 г.

Гродна абвясцілі крэпасцю 23 жніўня 1913 г., хоць працы на галоўнай крапасной пазіцыі былі на пачатковым этапе і сапраўднага гарнізона і ўзбраення крэпасць яшчэ не мела. Аднак камендантам быў ужо прызначаны генерал-лейтэнант М.Н. Кайгародаў.

Для ўзвядзення фартэцыі было створана 14 будаўнічых участкаў, кіраўнікамі якіх сталі інжынерныя афіцэры "Изыскательной" партыі. На ўчастках шырока прымянялася праца вольнанаёмных рабочых, цывільных падрадчыкаў, мясцовых сялян. Усё гэта спрыяла даволі хуткаму будаўніцтву фартоў і апорных пунктаў, але з пачаткам вайны ні адзін з іх не быў завершаны – у распараджэнні будаўнікоў былі няпоўныя два будаўнічыя сезоны. З ліпеня 1914 г. у крэпасці было абвешчана вайсковае становішча, а з 1 жніўня – асаднае. Аднак працы па будаўніцтву не спыняліся амаль да эвакуацыі 20 жніўня 1915 г. З адступленнем расійскіх войскаў ад Гродна ўсе ўмацаванні крапасной пазіцыі было загадана ўзарваць, што было зроблена з рознай ступенню стараннасці і пасьяховасці. Не паспелі знішчыць фартавую групу IV, паколькі яны былі раней захоплены германскімі войскамі.

Тэхналогія ўзвядзення была такая, што практычна з самага пачатку работ форт быў гатовы да абароны. На першай стадыі будаўніцтва – як палявы рэдут (катлаван для бруствера ў якасці стралковага акопа), потым – як часовае ўмацаванне (гатовы бетонны стралковы бруствер і роў з зачаткамі контрмінных галерэй і патэрн, якія можна было выкарыстоўваць як сховішча ад абстрэлаў). У самую апошнюю чаргу прыступілі да будаўніцтва прамежкавых і гаржавых паўкапаніраў, гаржавых казарм, абліцоўкі эскарпа і контрэскарпа. Аб'ект станавіўся доўгачасовым абарончым апорным пунктам – фортам.

Пасля вопытаў на востраве Беразань у 1912 г. былі выпрацаваны новыя прынцыпы будаўніцтва доўгачасовых збудаванняў у расійскіх крэпасцях. Да пачатку Першай сусветнай вайны яны былі выкарастаны пры праектаванні і ўзвядзенні фартоў у Гродна і Новагеоргіеўску, што зрабіла гэтыя крэпасці найбольш сучаснымі і здольнымі да працяглай абароны. Аналіз праектаў крапасных збудаванняў Гродна сведчыць, што падчас праектавання назіраецца свабода ў выбары формы фартоў у плане. Калі раней самай распаўсюджанай формай была трапецыя, то цяпер вайсковыя інжынеры прыменялі ад трохвугольнай да шматграннай, выкарыстоўваючы ў кожным канкрэтным выпадку асаблівасці мясцовасці.

Для артылерыйскіх і пяхотных назіральнікаў планавалася ўстаноўка бранявых назіральных пастоў у выглядзе вежаў. Такіх пастоў было некалькі праектаў. Палявыя даследаванні выявілі ўстаноўку бронепастоў праекта Галоўнага інжынернага упраўлення на фартах III, IV, V гродзенскай крэпасці. Недахопам бронепастоў было тое, што яны былі не цэльнымі, а састаўнымі, і разбураліся буйнакаліберным снарадамі.

Жылыя казармы ў новых фартах размяшчаліся з тылу, каб не трапіць пад артылерыйскі агонь падчас абстрэлу баявых збудаванняў форта. У некаторых выпадках меркавалася ўвогуле абысціся без казармы на фарце, абмяжоўваючыся надзейнымі сховішчамі для дзяжурнай часці са зручнымі выхадамі на стралковую пазіцыю. У такім выпадку гарнізон знаходзіўся за фартом у невялікіх сховішчах, размешчаных у складках мясцовасці. У доўгачасовых збудаваннях планаваліся прамежкавыя паўкапаніры і прадугледжваліся падземныя элементы (патэрны) для сувязі паміж асобнымі казематаванымі пабудовамі. Выхады з казематаваных збудаванняў закрываліся браніраванымі дзвярамі. Усе фарты ад падземнай атакі праціўніка забяспечваліся контрмінной сістэмай. Работы гэтыя адносіліся да трэцяй чаргі будаўніцтва і фактычна не былі пачаты. Усе казематаваныя памяшканні фартоў мелі магутнае пакрыццё таўшчынёй да 4 м, якія забяспечвалі надзейную абарону ад снарадаў вялікіх калібраў (280 і 420 мм).

Да пачатку вайны ні адзін з фартоў гродзенскай крэпасці не быў гатовы нават на 50%. На большасці фартоў былі ўзведзены толькі стралковыя брустверы і падбрустверныя галерэі. Брустверы ўзводзіліся «секцыйным» метадам і не былі завершаны. Не паспелі пабудаваць ні кофраў, ні капаніраў, ні тым больш патэрнаў, контрмінных галерэй і гаржавых казарм. Гэта не здзіўляе – у распараджэнні будаўнікоў пры малым фінансаванні і бюракратызме вайсковых і цывільных чыноўнікаў было няпоўных два будаўнічых сезона. У Гродна фактычна быў падрыхтаваны толькі каркас крэпаснай пазіцыі, якая, аднак, мела дастаткова моцныя абарончыя магчымасці [11].

З пачаткам Першай сусветнай вайны Гродна стаў важнай аперацыйнай базай рускіх войск. Крэпасць знаходзілася на подступах да Усходняй Прусіі і павінна была выконваць функцыі месца, дзе фарміраваліся, размяшчаліся, праходзілі абучэнне войскі, якія адпраўляліся на фронт, а таксама матэрыяльна і маральна падтрымліваць русскія арміі, што вялі баявыя дзеянні. Пасля разгрому рускіх войск ва Усходняй Прусіі ў канцы жніўня 1914 г., у раёне Аўгустаў–Гродна–Асавец канцэнтравалася 10-я руская армія, якая была створана для стабілізацыі фронта на гэтым участку. У Гродне размесціўся штаб арміі, а крэпасныя склады, казармы і лагеры сталі базай матэрыяльнага забяспячэння арміі. У верасні 1914 г. германскія войскі наблізіліся да крэпасной пазіцыі, аднак у выніку паспяховых дзеянняў рускіх войск былі вымушаны адступіць да граніцы.

Першыя баі Першай сусветнай вайны непасрэдна пад фартамі гродзенскай крэпасці адбыліся зімой 1915 г. Дзве германскія арміі 7 лютага пачалі наступленне на пазіцыі 10-й расійскай арміі генерала Ф.В. Сіверса ва Усходняй Прусіі (Аўгустоўская аперацыя) з мэтай акружыць і знішчыць. Дзякуючы супраціўленню XX армейскага корпуса генерала Булгакава, асноўнай часці 10-й арміі удалося адступіць, а XX корпус трапіў у акружэнне ў Аўгустоўскіх лясах за 20 км на паўночны захад ад Гродна. Немцы занялі Ліпск, Сапоцкін, выйшлі да Нёмана ў раёне

в. Гожа, перасеклі шашу Гродна-Сопоцкін. Заняўшы шэраг населеных пунктаў уздоўж дарогі, германскае камандаванне ўстанавіла артылерыю і пачало абстрэл пазіцый II і III фартоў з мэтай не дапусціць дэблакіроўкі акружанага расійскага войска.

Вечарам 18 лютага акружаныя войскі XX корпуса зрабілі спробу праравацца праз Сапоцкін да фартоў гродзненскай крэпасці. Аднак спроба не ўдалася: частка войска была знішчана за 7-8 км на захад ад Сапоцкіна паміж вёскамі Ліпілы – Волкуш – Багатыры Лясныя – Аўгустоўскі канал, другая частка войска ўзята ў палон 20-21 лютага ў раёне на паўночны захад ад в. Маркаўцы. У палон патрапілі 12 расійскіх генералаў, уключая камандзіра XX корпуса П.І. Булгакава, начальніка штаба К.Я. Шэмякіна, начальнікаў 27-й, 29-й і 53-й пяхотных дывізій Г.Г. Джонсана, А.М. Розеншыльда фон Паўліна і С.І. Фёдарава, брыгадных камандзіраў А.Э. Беймельбурга, І.А. Хольмсена, М.І. Чыжова і інш. Германскае войска таксама панесла цяжкія страты і напачатку сакавіка вымушана было адступіць з Аўгустоўскай пушчы на больш зручныя пазіцыі ва Усходняй Прусіі.

Наступны этап удзелу гродзенскай крэпасці ў баявых дзеяннях адносіцца да лета 1915 г. У выніку паспяховага наступлення германскіх войск у Карпатах і пад Прасныша расійскім камандаваннем была пакінута практычна ўся Польшча. 5 жніўня 1915 г. германскія войскі ўвайшлі ў Варшаву, у чэрвені–ліпені 1915 г. былі пакінуты крэпасці Асавец, Івангарад, Новагеоргіеўск. Фронт стабілізаваўся на лініі Коўна–Гродна–Брэст.

У ноч на 6 жніўня 1915 г. у штаб 10-й арміі і каменданту крэпасці паступіла тэлеграма галоўнакамандуючага Паўночна-Заходнім фронтам аб тым, што «крепость Гродно считать укрепленной позицией на фронте р. Неман–Гродно–Брест, причем приказано приступить немедленно к эвакуации крепостных запасов и имущества». З гэтага часу крэпасць Гродна стала звычайнай франтавой пазіцыяй і тэарэтычна як крэпасць перастала існаваць.

У сувязі са складанай абстаноўкай на фронце часці 10-й арміі былі адсунуты на паўночны ўсход ад Гродна. Згодна з распараджэннем Галоўнакамандуючага Паўночна-Заходнім фронтам у 12 гадзін ночы 10 жніўня крэпасць Гродна перайшла ў падпарадкаванне 1-й арміі, якой камандаваў генерал А.І. Літвінаў. 12 жніўня на адрас каменданта крэпасці і камандзіраў карпусоў паступіла тэлеграма з загадам знішчыць усе абарончыя збудаванні левабярэжнага абводу. Левабярэжны абвод уключаў у сябе 9 фартавых груп. Адначасова было загадана абараняць Гродна да апошняга. Для абароны крэпасці было пакінута 74 гарматы розных калібраў, 79 супрацьштурмавых палявых і 12 57-мм берагавых гармат.

16 жніўня ў непасрэднае падпарадкаванне каменданта крэпасці М.Н.Кайгародава было перададзена два корпусы 1-ай арміі: Зводны Асавецкі корпус у складзе дзвюх пяхотных дывізій (57-й і 111-й) і 1-шы армейскі корпус таксама ў складзе дзвюх пяхотных дывізій (22-я і 24-я). На флангах Гродна прыкрывалі часці яшчэ чатырох карпусоў пад камандаваннем генералаў Арцем'ева, Баланіна, Яўрэінава і Караткевіча. У гэты ж дзень паступіў загад абодвум карпусам пакінуць занятыя пазіцыі і заняць абарону на крапасным абводзе. Абарону ад в. Трычы да форта № IV заняла 24-я пяхотная дывізія пад камандаваннем генерал-маёра Палянскага ў складзе 4,5 тыс. штыкоў і 118-я, 119-я, 120-я, 239-я дружыны дзяржаўнага апалчэння.

Наступленне 1-й і 11-й ландверных і 75-й рэзервовай дывізій немцаў на фронце 1-га армейскага корпуса пачалося раніцай 18 жніўня. У ходзе жорстага бою расійская армія адступіла. На наступны дзень раніцай, разгарнуўшы дывізію ў напрамку вёсак Рагачы, Бяляны, Кусцінцы, немцы на працягу трох гадзін бою завалодалі рагачоўскімі пазіцыямі. Яны набылі выключна выгадны рубеж для артылерыйскага абстрэлу ўсяго тылу крапаснога абводу. Расійскае камандаванне недаацаніла значэнне пазіцый пад Рагачамі, пра што прызнаўся камандуючы 1-м армейскім корпусам генерал-лейтэнант А.А. Душкевіч.

Немцы ўстанавілі цяжкія артылерыйскія батарэі ў в. Хварасцяны, каля чыгуначнай станцыі Бяляны (на дарозе Гродна – Сувалкі) на рагачоўскіх пазіцыях і пад неперарыўным абстрэлам пачалі наступленне на 88-мы, 95-ты і 96-ты палкі, якія абаранялі IV форт і падступы да V. У нямецкіх крыніцах паведамляецца пра 35 батарэй, прыдадзеных тром германскім дывізіям. Пасля кожнай адбітай атакі артабстрэл узмацняўся. 19 жніўня пад вечар немцы завалодалі апорным пунктам № 8, а пазней № 6 і № 7. У выніку контратакі 88-га палка і батальёна 94-га палкоў апорны пункт № 6 быў адбіты. Але перамога была часовай.

Гарнізон IV форта, які складаўся з дзвюх рот апалчэнцаў, панёс незаменныя страты. На 4 гадзіны дня ён налічваў усяго 50 чалавек, былі выведзены з строю ўсе кулямёты. Накіраваныя для ўзмацнення гарнізона дзве роты былі расстраляны артагнём немцаў. Да форта змагло прабіцца не больш за 60 чалавек. У 5 гадзін 30 мінут немцы пачалі новы штурм IV форта, але былі адбіты. Пасля абстрэлу пазіцый шрапнэллю і фугасамі колькасць абаронцаў скарацілася да 30 салдат на чале з камандзірам батальёна 95 палка капітанам Наркевічам. Было вырашана ўзарваць форт і адступіць да горада. Ваенны інжынер капітан У.М. Дзясніцкі ўспамінаў пра гэтыя падзеі: «На форту 4 подорвать ничего не могли, т.к. шнуры были у подрывников отняты нижними чинами. Пороховой погреб не подорван, потому что был занят немцами раньше, чем мы вышли из форта. Общие выводы после 2 дней обстрела форта с технической точки зрения таковы: от снарядов бетон не пробивался. Воронка получалась диаметром около 0,30 саженя и глубиной до 2 дюймов. Всего за второй день по бетону было до 500 попаданий». Па сцверджанню інжынера, у памяшканнях форта знаходзілася да 150 раненых салдат, якіх не змаглі адправіць у тыл. Сярод абаронцаў форта пачалася паніка, салдаты кідалі зброю і таптали яе нагамі. Немцы падняліся на апошні

штурм, і форт быў захоплены неразбураным. З форта вырвалася толькі 7 чалавек, сярод якіх былі капітаны Наркевіч і Дзясніцкі. У нарысе «Wie Grodno deutsch wurde» («Як Гродна стаў нямецкім» – надрукаваны ў 1916 г.) сцвярджалася, што чацвёрты форт быў узяты 3-м ландверным пяхотным палком у 3 гадзіны 30 мінут 1 верасня. Наступнае ўмацаванне – форт IVa (вядомы як «малы форт», на самой справе апорны пункт № 8) таксама было захоплена, а 3 афіцэры, 679 салдат было забіта.

Адначасова з узяццем IV форта ў штаб крэпасці паступіла данясенне камандзіра зводнага Асавецкага корпуса аб ўзмацненні націску на 57-ю пяхотную дывізію, якая дыслацыравалася на пазіцыях I, II і III фартоў. Паступіў загад аб вывадзе палкоў з перадавых пазіцый. Адыход адбываўся пры моцным націску немцаў на левым флангу 226-га палка. З адыходам батальёна 227-га палка і батарэі 67-й артбрыгады, якія займалі вышыню 100.3, пяць левафланговых рот 226 –го палка былі акружаны і знішчаны.

Цяжкія баі разгарнуліся на пазіцыях форта № III у раёне в. Лабна-Агароднікі. Цяжкая артылерыя немцаў, устаноўленая на рагачоўскіх пазіцыях, без перашкоды вяла абстрэл гэтага форта і апорнага пункта «Г». Пасля артылерыйскай падрыхтоўкі нямецкія войск іпачалі штурм пазіцый, але некалькі разоў былі адбітыя. Вечарам 19 жніўня немцы пачалі апошні рашучы штурм. Але і на гэты раз ім не ўдалося захапіць пазіцыі, хоць абаронцаў амаль не засталося. У 12 гадзін ночы пачаўся агульны адвод расійскіх войскаў з левага берага Нёмана і знішчэнне ўсіх умацаванняў. У 2 гадзіны 20 мінут з 19 на 20 жніўня ваенны інжынер падпалкоўнік Модрах аддаў загад аб узрыве дзевяці 12,5-пудовых зарадаў піраксіліна, закладзеных у мінных калодзежах форта. Па сведчанню Модраха, былі ўзарваны фарты I, II, літарны «В», апорны пункт «Е», цэнтральная тэлефонная станцыя 3-га участка, бетонныя парахавы склеп і вадакачка.

Дырэктыва камандуючага 1-ай арміяй аб адыходзе гродзенскага атрада і суседніх карпусоў на правы бераг Нёмана была атрымана 19 жніўня ў 10 гадзін 30 мінут. Адыход было загадана пачаць у 12 гадзін ночы, папярэдне ўзарваўшы абарончыя збудаванні левабярэжнага крапаснога абводу. Згодна рапарту начальніка інжынераў, было ўзарвана 11 фартоў, 14 апорных пунктаў, 6 бетонных склепаў, 5 мастоў праз р. Нёман, 4 праз р. Ласосна і ўсе плывучыя сродкі па р. Нёман. Было ўзарвана або спалена 48 камплектаў вадакачак і розных механічных установак на лініі фартоў, 30 рухавікоў механічных установак, што належалі прыватным асобам, гарадскому самакіраванню і казённым установам, усе інжынерныя будынкі і склады, а таксама некаторыя каменныя будынкі, сярод якіх і чыгуначная станцыя. Акрамя гэтага, было знішчана больш за 700 тысяч пудоў рознай маёмасці, у тым ліку прадуктаў харчавання і фуражу.

Эвакуацыю не ўдалося правесці ў поўнай ступені з-за недахопу транспарту і хуткага прарыву абароны крэпасці. Па разліках камандавання крэпасці, для эвакуацыі маёмасці патрабавалася 3197 чыгуначных вагонаў. Вываз артылерыйскай маёмасці планавалася завяршыць да 15 жніўня, інтэнданцкай – да 24, інжынернай – да 31 жніўня. Аднак да 12 жніўня адміністрацыя чыгуначнага вакзала прадаставіла толькі некалькі вагонаў. Па гэтай прычыне інжынерная маёмасць вывозілася аўтамабільным і гужавым транспартам. Вываз маёмасці са станцыі Ласосна спыніўся 19 жніўня, са станцыі Гродна – 20 жніўня ў сувязі з захопам горада нямецкімі войскамі. Камандаванне 1-й арміі пераехала ў г. Ліда [12].

Калі гаварыць аб ролі Гродзенскай крэпасці ў баях Першай сусветнай вайны, неабходна ўспомніць словы вядомага спецыяліста-фартыфікатара В.В. Якаўлева аб тым, што ў сусветную вайну ўсе крэпасці адыгралі ролю, але не заўсёды ў той ступені, як гэта планавалася ў мірны час [13, с. 380]. Гродзенская крэпасць, нягледзячы на незавершанасць будаўніцтва фартыфікацыйных збудаванняў, была для рускай арміі важнай аперацыйнай базай, месцам фарміравання і абучэння войск, якія потым прымалі ўдзел у баявых дзеяннях на фронце, пунктам матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння войск, моцным маральным фактарам для арміі і насельніцтва. Гістарычна склалася так, што будаўніцтва крэпасці ў Гродна была прынята назадоўга да пачатку Першай сусветнай вайны і развалу дзяржавы. Таму Гродзенскую крэпасць можна назваць апошняй крэпасцю Расійскай імперыі.

*Артыкул падрыхтаваны пад час выканання Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2011-2015 гг. "Гуманітарныя навукі як фактар развіцця беларускага грамадства і дзяржаўнай ідэалогіі".*

**ЛІТАРАТУРА**

1. Пивоварчик, С.А. Белорусские земли в системе фортификационного строительства Российской империи и СССР (1772 – 1941) / С.А. Пивоварчик – Гродно: ГрГУ, 2006. – 252 с.
2. План г. Гродно с проектами укрепления оного. Б.д. // Российский государственный военно-исторический архив. – Фонд 349. – Оп. 12. – Д. 1481.
3. План г. Гродно с означением вновь проектируемой крепости. 1807 г. // Российский государственный военно-исторический архив. – Фонд 349. – Оп. 12. – Д. 1484.
4. Szymański, S. Niezrealizowany rosyjski projekt ufortyfikowania Grodna przed wyprawą Napoleona na Moskwę / S. Szymański // Studia i materiały do historii wojskowości. – T. XII, cz. 1. – Warszawa, 1966. – S. 231–235.
5. Российский государственный военно-исторический архив. – Фонд 349. – Оп. 12. — Увеличенный план города Гродны с наложением проэкта укрепления оного. 1831 г. // Д. 1487.
6. Заянчковский, А.М. Подготовка России к империалистической войне: Очерки военной подготовки и первоначальных планов / А.М. Заянчковский. – М, 1926. – 429 с.

7. Доклад по Штабу Виленского военного округа «История возникновения гродненской укрепленной позиции». 1907 г. // Российский государственный военно-исторический архив. – Фонд 13129. – Оп. 1. – Д. 5.
8. История военной стратегии России / Под ред. В.А. Золоторева. – М.: Кучково поле, Полиграфресурсы, 2000. – 592 с.
9. Рапорт генерал-майора Кайгородова о работе Изыскательной партии от 20 ноября 1911 г. // Российский государственный военно-исторический архив (РГВИА) – Фонд 13129. – Оп. 3. – Д. 954. – Л. 8-13.
10. Соображения о стратегическом назначении Гродненской крепости 1912 г. // Российский государственный военно-исторический архив (РГВИА) – Фонд 13129. – Оп. 1. – Д. 499. – Л. 1–6об.
11. Пивоварчик, С.А. Гродненская фортификация XIX – нач. XX вв. От укрепленной позиции к первоклассной крепости / С.А. Пивоварчик // Цитадель. Сборник статей по истории фортификации и военно-морского флота. – 2005. – № 12. – С. 47–59.
12. Плешевеня, А. Каля Гродзенских фартоў / А. Плешевеня // Памяць. Гродна: Гіст.-дакум. хроніка. – Мінск, БЕЛТА, 1999 / А. Плешевеня. – С. 214–224.
13. Яковлев, В.В. История крепостей / В.В. Яковлев. – М.: ООО «Фирма «Издательство Аст»; ООО «Издательство Полигон», 2000. – 400 с.

**БАЮРА В.Н.**
Кандидат географических наук, старший научный сотрудник Московского государственного университета им. М.В.Ломоносова, г. Москва, Россия

## ВОЕННО-ИСТОРИЧЕСКИЙ ТУРИЗМ И ФОРТИФИКАЦИОННЫЕ СООРУЖЕНИЯ ПЕРВОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЫ

В 2014 г. народы многих стран будут отмечать 100-летие Первой мировой войны.

Граждане разных государств будут как в составе организованных групп, так и в индивидуальном порядке посещать места великих битв и сражений. Особое внимание туристы уделяют осмотру и изучению сохранившихся объектов военно-исторического наследия – крепостей, фортов и других военных сооружений.

Военно-исторический туризм получил значительное развитие в последние годы во всем мире, включая Россию. Так, по данным английской газеты The Guardian, только во Францию ежегодно приезжает более 20 млн. человек, основной целью которых является посещение мест знаменитых битв и сражений, памятников воинской славы и военной истории. В 2011 г. во Франции прошла первая национальная конференция по военно-историческому туризму. Там отмечалось, что туры по местам боевых сражений и боевой славы могут принести значительный доход стране, а также выполнять важнейшую задачу по сохранению коллективной памяти о трагических событиях войн и сражений. В Республике Беларусь, по данным белорусского агентства «Интерфакс», за 2012 г. военно-исторические комплексы приняли более 300 тысяч туристов. Значительный прирост числа участников военно-исторического туризма зафиксирован и в России, чему способствовало отмечавшееся в 2012 г. 200-летие Бородинской битвы.

В Западной Европе особой популярностью пользуются военно-исторические туры, связанные с посещением мест боевых событий наполеоновских войн, а также Первой и Второй мировых войн. Тысячи путешественников, любителей военной истории ежегодно посещают Ватерлоо (Бельгия), Аустерлиц (Чехия), и другие места знаменитых битв наполеоновской армии.

Существуют разные точки зрения на проблему дефиниции военно-исторического туризма и классификации его видов (Баюра, 2009, Карпов, 2007, и др.). Некоторые исследователи предпочитают термин «военный туризм», относя все военно-исторические реконструкции, фестивали и праздники к категории «событийного туризма». Другие предпочитают термин «фортификационный туризм», делая упор на туристский интерес к незыблемой в веках системе оборонительных сооружений (крепостей, замков, фортов). Третьи готовы любые посещения военно-исторических экспозиций, музеев и объектов причислить к военно-историческому туризму.

На наш взгляд, к военно-историческому туризму можно отнести те путешествия людей, основная мотивация которых так или иначе связана с событиями военной истории или исторической военно-технической проблематикой. Само по себе кратковременное посещение тех или иных памятных мест военной истории, музеев воинской славы и тому подобных объектов часто является лишь незначительным компонентом обычных познавательных туров, но это еще не военно-исторический туризм.

Следует также отдельно рассматривать военный (или армейский) туризм. Он привлекает также значительное число людей, которым интересно познакомиться с военно-технической компонентой современной армии (военно-технический туризм), в течение короткого периода «вкусить прелести» полевой армейской жизни.

Военно-технические туры появились лишь в последние десятилетия. Сейчас турфирмы разных стран предлагают самые разные варианты военно-технических туров, от обзорных до активных, в ходе которых любители военной техники могут сами и полетать на военном самолете, и прокатиться на танке, и пострелять из огнемета или гранатомета, и прыгнуть с парашютом с военных самолетов.